9. Столетие Военного министерства. 1802–1902. Т. 1. Исторический очерк развития военного управления в России / сост. Н. А. Данилов. Спб., 680 с.
10. Столетие Военного министерства. 1802–1902. Т. 4. Главный штаб: Исторический очерк. Ч. 1. Кн. 1. Отд. 2. Комплектование войск в царствование Александра I / сост В. В. Щепетельников. Спб, 1902. 212 с.
11. Федоров В. А. Солдатское движение в годы декабристов. 1816–1825 гг. М., 1963. 207 с.

# СУПРАЦОЎНІЦТВА ПОЛЬСКА-РАСІЙСКА-УКРАІНСКАЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ КАМІСІІ З ЦЭНТРАЛЬНЫМ АРХІВАМ БССР ПА ПЫТАННІ РЭЭВАКУАЦЫІ АРХІЎНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў 1922–1929 гг.

***В. М. Бароўская***

*Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі НАН Беларусі», вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

У ходзе дзейнасці Змешанай спецыяльнай камісіі ў 1922–1929 гг. адбывалася дастаткова шчыльнае супрацоўніцтва з прадстаўнікамі Цэнтральнага архіву БССР. Беларускія архівісты ўдзельнічалі ў адборы, падрыхтоўцы і перадачы архіўных матэрыялаў Польшчы. Акрамя таго, па ініцыятыве намесніка загадчыка Цэнтрархіва БССР М. В. Мялешкі рээвакуіраваны з Варшавы архіўныя дакументы былога Мінскага ўпраўлення Дзяржаўных маёмасцей. У ходзе функцыянавання Польска-расійска-украінскай спецыяльнай камісіі на тэрыторыі Беларусі ў 1922–1929 гг. заўважна жаданне беларускага савецкага кіраўніцтва не падпарадкавацца рашэнням савецкай дэлегацыі, ухіліцца ад рээвакуацыі той або іншай маёмасці.

***Ключавыя словы:*** рээвакуацыя; Змешаная спецыяльная камісія; архіў.

# СОТРУДНИЧЕСТВО ПОЛЬСКО-РОССИЙСКО-УКРАИНСКОЙ СПЕЦИАЛЬНОЙ КОМИССИИ С ЦЕНТРАЛЬНЫМ АРХИВОМ БССР ПО ВОПРОСУРЕЭВАКУАЦИИ АРХИВНОГО НАСЛЕДИЯ В 1922–1929 гг.

***О. Н. Боровская***

*Государственное научное учреждение «Институт истории НАН Беларуси», ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, borovskaya-olga@mail.ru*

В ходе деятельности Смешанной специальной комиссии в 1922–1929 гг. необходимо отметить плодотворное сотрудничество с представителями Центрального архива БССР. Белорусские архивисты участвовали в отборе, подготовке и передаче архивных материалов Польше. Кроме того, по инициативе заместителя председателя Центрархива БССР М. В. Мелешко реэвакуированы из Варшавы архивные документы бывшего Минского управления Государственного имущества. В ходе функционирования Польско-российско-украинской специальной комиссии на территории Беларуси в 1922–1929 гг. можно отметить стремление белорусского советского руководства не подчинятся решениям советской делегации, уйти от реэвакуации того или иного имущества.

***Ключевые слова:*** реэвакуация; Смешанная специальная комиссия; архив.

## COOPERATION OF THE POLISH-RUSSIAN-UKRAINIAN SPECIAL COMMISSION WITH THE CENTRAL ARCHIVE OF THE BSSR ON THE ISSUE RE-EVACATION OF ARCHIVAL HERITAGE IN 1922–1929

***O. N. Borovskaya***

*The State Scientific Institution «The Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus», Academic str., 1, 220072, Minsk, Belarus*
*borovskaya-olga@mail.ru*

During the activities of the Mixed Special Commission in 1922-1929. It should be noted fruitful cooperation with representatives of the Central Archive of the BSSR. Belarusian archivists participated in the selection, preparation and transfer of archival materials to Poland. In addition, at the initiative of M. V. Meleshko, archival documents of the former Minsk Department of State Property were re-evacuated from Warsaw. During the functioning of the Polish-Russian-Ukrainian special commission on the territory of Belarus in 1922-1929 one can note the desire of the Belarusian Soviet leadership not to obey the decisions of the Soviet delegation, to avoid the re-evacuation of this or that property.

***Keywords:*** reevacuation; Mixed Special Commission; archive.

Працэс практычнай рэалізацыі XI артыкула Рыжскага мірнага дагавора, рэстытуцыі культурных каштоўнасцей так ці іначай закранаў інтарэсы беларускага народа і яго архіўнай спадчыны. У выніку працы камісіі па выяўленні тых ці іншых рарытэтаў спецыялісты прыходзілі да высновы, што частка прадметаў тэрытарыяльна і гістарычна звязана не з польскім народам, а з беларускімі і ўкраінскімі землямі.

Пытаннямі перадачы архіўных матэрыялаў і дакументаў займалася створаная 7 кастрычніка 1921 г. змешаная спецыяльная расійска-украінска-польская камісія, яе бібліятэчна-архіўная частка. На чале польскага боку стаяў А. Альшэўскі, савецкага – О. Ю. Шмідт (пасля яго змяніў П. Л. Войкаў). У рамках камісіі існавалі пасады экспертаў. Яе месцазнаходжаннем была выбрана Масква, з аддзяленнямі ў Санкт-Пецярбурзе і Варшаве. Яшчэ да пачатку працы Змешанай камісіі, на пасяджэнні калегіі Галоўнага архіўнага ўпраўлення РСФСР 30 снежня 1920 г. было разгледжана пытанне «Аб перадачы польскіх архіваў польскаму ўраду». У выніку была створана камісія, у складзе М. П. Чулкова, В. В. Макарава, М. Ф. Бельчыкава, С. К. Багаяўленскага, У. І. Пічэты, пад старшынствам У. В. Адарацкага [1; 2].

Польская дэлегацыя ў Змешанай спецыяльнай камісіі, якая прыехала ў Маскву, патрабавала вярнуць ёй усе навуковыя і культурныя каштоўнасці, якія былі вывезены з яе тэрыторыі з 1 студзеня 1772 г. Згодна з п. 7. арт. XI

Рыжскага мірнага дагавора, абодва бакі далі ўрачыстае абяцанне не парушаць скарбніцы сусветнага значэння, сістэматызаваныя і навукова-апрацаваныя, за выключэннем тых выпадкаў, калі прадметы, якія ўваходзяць у зборы, маюць цесную сувязь з гісторыяй ці культурай Польшчы [3]. Як адзначаў А. Ф. Ізюмаў, эксперт бібліятэчна-архіўнай часткі Змешанай спецыяльнай камісіі са снежня 1921 г. па верасень 1922 г., «гэта давала магчымасць расійскай навуковай экспертызе абапірацца на гэты шлях для адстойвання найбольш каштоўных помнікаў культуры ад разбурэння» [4].

Польская дэлегацыя ў справаздачы камісіі адзначала цяжкасці, з якімі сутыкнулася, што стала прычынай таго, што значная частка архіўнай, бібліятэчнай і музейнай спадчыны засталася на тэрыторыі СССР. Сярод перашкод адзначаюцца: 1) фармалістычнае інтэрпрэтаванне артыкулаў Рыжскага дагавора савецкім бокам, які нават пры прадстаўленні палякамі дастатковай дакументальнай базы, патрабавала ўказаць дакладнае месцазнаходжанне той або іншай калекцыі, прадмета; 2) негатыўныя адносіны савецкага боку да Польшчы, усялякае зацягванне працы, ухіленне ад разгляду спраў. У выніку адбылося 235 пасяджэнняў з афармленнем пратаколаў, з іх – 48 пленарных і 187 пасяджэнняў падкамісій. Да гэтай лічбы неабходна дадаць сустрэчы ў фармаце кожны дзень старшынь дэлегацый, членамі дэлегацый, экспертаў [5].

Расійска-украінская частка Змешанай спецыяльнай камісіі знаходзілася ў цеснай сувязі з архіўнымі ўпраўленнямі БССР і УССР. Так, Цэнтральны архіў пры УЦВК РСФСР 19 чэрвеня 1924 г. паведамляў у Цэнтральны архіў БССР, што «перад СССР паўстала пытанне аб перадачы польскаму ўраду архіваў дзяржаўных і грамадскіх устаноў Мінскай губерні ў той частцы, якая адносіцца да тэрыторыі цяперашняй Польшчы». Для правядзення экспертызы каштоўнасці матэрыялу, які падлягае эвакуацыі, у Мінск камандзіраваўся супрацоўнік Цэнтрархіва РСФСР С. К. Багаяўленскі [6, арк. 59]. У выніку працы апошняга адбылося абследванне архіўнага фонду і вылучана значная колькасць дакументаў былой Мінскай губерні (Навагрудскі і Пінскі паветы), якія павінны быць перададзены Польшчы па XI артыкуле Рыжскага мірнага дагавора [6, арк. 446].

Расійска-украінская дэлегацыя паведамляла ў Цэнтрархіў БССР, што на аснове Пастановы Змешанай спецыяльнай камісі ад 27 чэрвеня 1923 г. і Дамовы старшынь дэлегацый СССР і Польшчы ад 10 ліпеня, падлягаюць звароту ў БССР, вывезеныя з Мінску архіўныя матэрыялы былога Мінскага ўпраўлення Дзяржаўных маёмасцяў. «Адзначаныя матэрыялы ў цяперашні

час польскім бокам ужо адабраны і знаходзяцца ў Варшаве. Польская дэлегацыя прапаноўнае наступны план іх перадачы: прадстаўнік Польскай дэлегацыі і ўпаўнаважаны дэлегацыі СССР – супрацоўнік паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Польшчы апячатваюць – без папярэднага агляду – гэтыя матэрыялы сваімі пячаткамі, пасля чаго яны адпраўляюцца ў Мінск на адрас Беларускага Цэнтрархіву» [7, арк. 153].

Згодна з «Інструкцыяй для высвятлення і падзелу архіўных матэрыялаў Валынскай і Мінскай губерняў на аснове арт. III Генеральнай Дамовы старшынь Дэлегацый СССР і Польшчы ад 16 лістапада 1927 г. » папярэдняе выяўленне архіўных матэрыялаў, якія падлягалі перадачы таму або іншаму боку, павінны былі адбывацца адпаведнымі архіўнымі ўпраўленнямі па месцы знаходжання гэтых матэрыялаў. Архівы губернскіх устаноў лічыліся прыналежнасцю адпаведнага губернскага цэнтра, пры гэтым справы, якія датычылі меншых адміністрацыйных адзінак, выдзяляліся для перадачы таму боку, на тэрыторыі якой знаходзіліся цэнтры гэтых меншых адзінак. Для абмеркавання пытанняў, звязаных з працамі па выяўленні, а таксама для ўсталявання поўнага пераліку матэрыялаў, якія падлягалі перадачы таму або іншаму боку, ствараліся ў Мінску і Жытоміры Нарады. Апошнія складаліся з упаўнаважаных: двух ад дэлегацыі СССР і двух – ад Польшчы, пры гэтым да ўдзелу маглі далучацца прадстаўнікі архіўных ведамстваў з дарадчым голасам. Пры неабходнасці адпаведныя Нарады маглі склікацца і на тэрыторыі Польшчы. Ад польскага боку 16 лістапада 1927 г. быў пазначаны В. Вейтко і Г. Янкоўскі (генеральны консул Польшчы ў Мінску), ад савецкага боку – Дз. Ф. Жылуновіч (загадчык Цэнтрархіва БССР) і І. А. Віткоўскі (прадстаўнік Беларускай акадэміі навук) [6, арк. 54].

Нарады разглядалі (па спісам ці ў натуры) сабраны для перадачы таму або іншаму боку матэрыял з правам уносіць з свайго боку дапаўненні на аснове вопісаў ці іншага рэгістрацыйнага матэрыялу, які знаходзіўся ў распараджэнні адпаведнага архіўнага ўпраўлення. У выпадку недастатковай вызначанасці загалоўка ў вопісу, адпаведная справа, кніга або звязка разглядаліся ў натуры. У выпадку няўзгодненасці меркаванняў бакоў у Нарадах, пытанне перадавалася для канчатковага вырашэння старшынямі дэлегацый. 16 лістапада 1927 г. адбылося I пасяджэнне Нарады па выкананні арт. III Генеральнай дамовы па спецыяльнай змешанай камісіі. На ім прысутнічалі: Дз. Ф. Жылуновіч, І. А. Вікоўскі, І. С. Дуван (генеральны сакратар дэлегацыі СССР), М. В. Мелешка (намеснік загадчыка Цэнтрархіва БССР), М. І. Маліноўскі (прадстаўнік НКУС БССР), В. Сухадольскі (намеснік старшыні польскай дэлегацыі ў Змешанай

спецыяльнай камісіі), Г. Янкоўскі (генеральны консул Польшчы), В. Вейтко (эксперт польскай дэлегацыі) [6, арк. 62].

З-за адсутнасці вопісаў і рэестраў, якія падлягалі выяўленню і падзелу архіўных матэрыялаў, быў заслуханы спіс, складзены Цэнтрархівам БССР. Акрамя таго, польскі прадстаўнік В. Сухадольскі ўзняў пытанне аб месцазнаходжанні спраў па валасцям Слуцкага, Мінскага і Мазырскага паветаў, якія адышлі да Польшчы. М. В. Мелешка заявіў, што ў матэрыялах былой Мінскай губерні, за выключэннем некаторай колькасці метрычных кніг, адсутнічаюць згаданыя матэрыялы.

Напрацягу трох гадоў працягвалася праца па адборы дакументаў, у выніку былі падрыхтаваны 255 кулёў матэрыялаў, якія датычылися гісторыі былой Мінскай губерні, Пінскага і Навагрудскага паветаў. Аднак, як канстатуе М. В. Мялешка, архівісты сутыкнуліся з сітуацыяй, што неабходна было яшчэ раз ажыццявіць перагляд ужо адабраных спраў, каб выключыць усялякую памылку. Беларускіх спецыялістаў значна турбаваў той факт, што планавалася ўтварэнне камісіі па кантролю за працэсам па адборы «польскіх фондаў», у якую павінны былі ўвайсці па два прадстаўнікі ад польскага і савецкага бакоў, так як «некаторыя архівы планавалася паказаць як неіснуючыя». Каб пэўным чынам схаваць фальсіфікацыю, беларускі бок вырашыў: па-першае, перамясціць усе дакументы ў адно архівасховішча, па-другое, не дапускаць польскіх дэлегатаў на тых сховішчаў, дзе іх прысутнасць была не пажаданай [6, арк. 11–13.].

У лісце ўпаўнаважанаму НКЗС СССР пры ўрадзе БССР 22 верасня 1928 г. указвалася, што «калі Польшчы сапраўды перадаць усе архіўныя матэрыялы, якія адносяцца да тэрыторыі часткі былой Мінскай губерні, якая згодна з Рыжскім мірным дагаворам адышла польскаму боку, як тое патрабуе інструкцыя па гэтым пытанні, то гэтым будзе нанесены значны ўрон культурнаму будаўніцтву БССР. Амаль ва ўсіх архіўных фондах губернскіх установаў, засяроджаных у цяперашні час у Мінскім гістарычным архіве, маюцца справы і кнігі, якія адносяцца да Пінскага і Навагрудскага паветаў, выемка гэтых архіўных матэрыялаў з губернскіх фондаў раз'ядnae ўсе фонды, ад гэтага яны страцяць сваё навуковае значэнне» [7, арк. 11–13]. Так як адмовіцца ад перадачы Польшчы архіваў цалкам было не магчыма, то зацікаўленыя ў гэтай справе ўстановы БССР лічылі і настойвалі на неабходнасці, як мага болей звузіць гэтую перадачу і выдзяліць для Польшчы толькі тое, што зусім лёгка будзе адабраць з Мінскага гістарычнага архіву.

29 снежня 1928 г. Цэнтральнае архіўнае ўпраўленне БССР паведамляла ў Прэзідыум ЦВК БССР аб заканчэнні працы па падрыхтоўцы архіўных дакументаў для перадачы іх польскаму боку: «сшыты ў 255 кулёў, запламбіраваны мытняй і знаходзяцца ў Цэнтрархіве да атрымання дазволу ад НКЗС СССР на іх адпраўку за мяжу» [8, арк. 22]. Перадача дакументаў адбылася 11 студзеня 1929 г. на ст. Негарэлае пры прысутнасці прадстаўніка ад савецкага боку М. А. Цэвелюка і польскага боку – В. Кажухоўскага, намесніка загадчыка Цэнтрархіва БССР М. В. Мялешкі, Негарэлаўскай мытні – М. І. Даніловіча, Глаўліта БССР – А. В. Крыловіча. У агульнай колькасці 44 звязкі і 7621 справы, упакаваныя ў 259 дарожны куль і апламбіраваныя [8, арк. 17].

Згодна з умовамі Рыжскага мірнага дагавора (артыкул XI) прадугледжвалася рээвакуацыя архіўных, музейных і бібліятэчных збораў. Для практычнай рэалізацыі гэтага артыкула стваралася Змешаная спецыяльная камісія, бібліятэчна-архіўная частка. Праца камісіі патрабавала прыцягнення значнай колькасці экспертаў, дадатковага фінансавання, рэстаўрацыі і далейшай падрыхтоўцы да транспарціроўкі каштоўных культурных артэфактаў. У выніку большасць прэтэнзій польскай дэлегацыі было задаволена ці вырашана палюбоўна шляхам прадастаўлення раўназначнага эквівалента. У ходзе дзейнасці Змешанай спецыяльнай камісіі ў 1922–1929 гг. адбывалася дастаткова шчыльнае супрацоўніцтва з прадстаўнікамі Цэнтральнага архіву БССР: М. В. Мялешкам, Дз. Ф. Жылуновічам і іншымі. Беларускія архівісты пры актыўным удзеле С. К. Багаяўленскага, эксперта камісіі, удзельнічалі ў адборы, падрыхтоўцы і перадачы архіўных матэрыялаў Польшчы. Акрамя таго па ініцыятыве М. В. Мялешкі быў ажыццяўлены зварот з Варшавы архіўных матэрыялаў былога Мінскага ўпраўлення Дзяржаўных маёмасцей, Мінскай балотнай станцыі

**Бібліяграфічны спіс**

1. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (ДАРФ). Ф. Р-5325. Воп. 9. Спр. 292.
2. «Спасены архивные дела…» Из протоколов руководящего органа управления архивным делом в 1918–1928 гг. Публ. подг. О. Н. Копыловой и Т. И. Хорхординой // Отечественные архивы. 2010. № 5. С. 98–108.
3. Цаплин В. В. О праве собственности на архивные документы в дипломатических актах дореволюционной и советской России // Отечественные архивы. 1992. № 4. С. 20–26.
4. Изюмов А. Ф. Культурные сокровища России и требования Польши // Новая русская книга. Выпуск 9. Берлин: Издательство И. П. Ладыжникова, 1922. С. 2728.
5. Dokumenty dotyczące akcji Polskich w Komisjach Mieszanych Reewakuacyjnej i Specjalnej w Moskwie. Z. 1–9. Warszawa, 1922–1924.

6. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 249. Воп. 4. Спр. 6.
7. НАРБ. Ф. 249. Воп. 4. Спр. 7.
8. НАРБ. Ф. 249. Воп. 4. Спр. 8.

# «КУЛЬТУРА АРХИВА»: ВОЗНИКНОВЕНИЕ ТРАДИЦИИ СОХРАНЕНИЯ ДОКУМЕНТИРОВАННОЙ ИНФОРМАЦИИ В ДРЕВНЕЙШИХ ЦИВИЛИЗАЦИЯХ

***Т. Д. Гернович***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, tat. gernovich@gmail.com*

В статье рассматривается проблема изучения истории архивов Древнего Востока, Древней Греции и Рима не только как истории архивов зарубежных стран, а как всеобщая история архивов. В трудах исследователей отмечается, что подходы по организации архивов, работе с документами, обеспечению сохранности схожи с современными практиками архивного дела в различных странах. Обосновывается, что цивилизации Древнего Востока, Древней Греции и Рима, стали для человечества не только колыбелью возникновения письменности, но и зарождения «архивной культуры», благодаря которой была заложена традиция фиксации, хранения и использования документированной информации. В историографии выделяются различные точки зрения на механизм формирования «архивной культуры» как единой традиции, существовавшей в данном регионе, а позже заимствованной и распространённой в европейских странах в Средние века.

***Ключевые слова:*** архив; документ; история архивного дела; Древний Восток; Древняя Греция и Рим; история письменности.

# «CULTURE OF THE ARCHIVE»: THE RISE OF THE TRADITION OF PRESERVATION OF DOCUMENTS IN ANCIENT CIVILIZATIONS

***T. D. Hiarnovich***

*Belarusian State University, Niezaliežnasci Avenue, 4, 220030, Minsk, Belarus,*

*tat. gernovich@gmail.com*

The article deals with the problem of studying the history of the archives of the Ancient East, Ancient Greece and Rome, not only as the history of the archives of foreign countries, but as a general history of archives. In the works of researchers, it is noted that the approaches to organizing archives, working with documents, and ensuring safety are similar to modern archiving practices in various countries. It is substantiated that the civilizations of the Ancient East, Ancient Greece and Rome, became for humanity not only the cradle of the emergence of writing, but also the birth of the «archival culture», thanks to which the tradition of fixing, storing and using documented information was laid. In historiography, there are different points of view on the mechanism of formation of the «archival culture» as a single tradition that existed in the region, and later borrowed and spread in European countries in the Middle Ages.

***Keywords:*** archive; document; history of archiving; The Ancient East; Ancient Greece and Rome; history of writing.